> ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫ САВЕЦКІ НАРОД СУСТРАКАЕ 50-ГОДДЗЕ УТВАРЭННЯ СССР МАГУТНЫМ, МАНАЛІТНА ЗГУРТАВАНЫМ, УПЭЎНЕНА І МЭТАНАКІРАВАНА ІДУЧЫМ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ НАПЕРАД ПА ШЛЯХУ, НАМЕЧАНАМУ ЯЕ ПРАГРАМАЙ, XXIV З'ЕЗДАМ КПСС.
>
> З Пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».


*ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 37 (131) | Субота, 9 снежня 1972 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.


## ВЯЛІКАМУ ЮБІЛЕЮ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА




МАСКВА. Да паўвекавога юбілею ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік Міністэрства сувязі СССР выпускае спецыяльную серыю марак і блок «50 год Дэкларацыі і Дагавору аб ўтварэнні СССР».

Серыя адкрываецца партрэтам У. І. Леніна.

## ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ СПАБОРНІЦТВА

**У мінулую сераду адбылося сумеснае пасяджэнне парткома, прафкома і мясцкома універсітэта. Падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва кафедр, факультэтаў і адміністрацыйна-гаспадаркай часткі універсітэта па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда КПСС і дастойнай сустрэчы знамянальнага юбілею — 50-годдзя з дня ўтварэння СССР.**

**Сярод факультэтаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва стаў гісторыка-філалагічны. Другое месца прысуджана механіка-матэматычнаму і трэцяе — біёлага-глебаваму факультэтам.**

**Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва лепшымі ва універсітэце прызнаны: кафедра педагогікі і псіхалогіі, кафедра грамадзянскай абароны, кафедра беларускай і рускай моў. Другое месца прысуджана кафедры філасофіі, кафедры алгебры і геаметрыі, кафедры фізіялогіі спорта і спартыўнай медыцыны, а трэцяе — кафедры гісторыі КПСС, кафедры палітэканоміі, кафедры фізіялогіі раслін, кафедры фізікі цвёрдага цела.**

**Па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы першынство ў сацыялістычным спаборніцтве заваявала бібліятэка, другое месца — за вучэбнай часткай, трэцяе — за работнікамі бухгалтэрыі.**

**Першынство ў сацыялістычным спаборніцтве сярод вучэбных карпусоў і інтэрнатаў заваяваў інтэрнат № 2, на другім месцы — вучэбны корпус № 1 і на трэцім — інтэрнат № 1.**

## СЕМІНАР САКРАТАРОЎ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

6 снежня праведзен семінар сакратароў пярвічных партыйных арганізацый універсітэта. На ім абмеркавана пытанне «Аб падрыхтоўцы да абмену партыйных білетаў», па якому выступілі сакратар парткома У. В. Казлоў і намеснік сакратара парткома Я. А. Семянчук.

На семінары абмеркаваны таксама пытанні: «Аб ходзе падрыхтоўкі да святкавання 50-годдзя ўтварэння СССР» і «Аб стане вучобы ў сістэме партыйнай асветы».

## РАСТУЦЬ РАДЫ КАМУНІСТАЎ

Удвая памятным будзе сёлетні год для адной з лепшых студэнтак чацвёртага курса біёлага-глебавага факультэта Надзежды Кучаравенка. Пярвічная партыйная арганізацыя прыняла яе кандыдатам у члены КПСС. Такую ж радасць і хваляванне перажыў напярэдадні знамянальнага юбілею СССР і аспірант гэтага факультэта Уладзімір Родзікаў, які таксама прыняты кандыдатам у члены КПСС.

З кандыдатаў у члены КПСС прыняты гэтымі днямі дацэнт В. П. Стаўроў, выкладчык універсітэта Ю. А. Кашын і студэнт Р. Р. Дуб.

Рашэнні пярвічных партыйных арганізацый аб прыёме названых таварышаў кандыдатамі ў члены КПСС і ў члены Камуністычнай партыі зацверджаны 6 снежня на пасяджэнні парткома універсітэта.

## ДНІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

**У сталіцы нашай Радзімы — Маскве — на ВДНГ прайшлі Дні Беларускай ССР, якія прысвячаліся 50-годдзю ўтварэння СССР. У саставе дэлегацыі рэспублікі быў і рэктар нашага універсітэта акадэмік Ул. А. Белы.**

**Трэцяга снежня ў Доме культуры ВДНГ адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны нашай рэспубліцы і завяршэнню Дзён Беларусі на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі. На гэтым вечары цёпла сустрэты прысутнымі выступіў і пасланец квітнеючай Гомельшчыны, відны вучоны Ул. А. Белы.**

## ДРУЖБЕ РАЗВІВАЦЦА І МАЦНЕЦЬ!



**НА ЗДЫМКУ: сустрэча гасцей на вакзале.**

НАБЛІЖАЕЦЦА знамянальны для савецкіх людзей юбілей — 50-годдзе з дня ўтварэння Саюза ССР. У летапіс падрыхтоўкі да гэтага слаўнага свята ўпісана нямала яркіх старонак.

Для нашага універсітэта юбілейны год паслужыў наладжванню цесных сувязей са шматтысячным калектывам выкладчыкаў і студэнтаў Днепрапятроўскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя 300-годдзя ўз'яднання Украіны з Расіяй. Пачатак дружбе быў пакладзен паўтара месяца таму назад, калі наша дэлегацыя на чале з сакратаром парткома У. В. Казловым наведала горад на Дняпры. На ўкраінскай зямлі гамяльчан сустрэлі сардэчна і гасцінна. Дні прабыцця ў Днепрапятроўску зрабілі на іх вялікае ўражанне.

У адказ на цёплы прыём днепрапятроўскія сябры былі запрошаны ў Гомель. Да гэтай сустрэчы ў нашым універсітэце рыхтаваліся як да сапраўднага свята. Хацелася зрабіць усё неабходнае для таго, каб днепрапятроўцы на беларускай зямлі таксама адчулі гасціннасць і шчырасць, каб ад наведвання нашага універсітэта ў іх засталіся самыя добрыя ўспаміны.

Дэлегацыя ДДУ прыбыла ў Гомель першага снежня. На вакзале яе сустракалі прарэктар па вучэбнай рабоце Д. А. Лявончанка, сакратар парткома У. В. Казлоў, старшыня прафкома М. Л. Байда, старшыня мясцкома Ф. Ф. Ганчэль, намеснік сакратара камітэта камсамола Яніна Лялькова і група студэнтак біёлага-глебавага факультэта, якія прыпаднеслі гасцям букеты жывых кветак. У саставе дэлегацыі гасцей былі: яе кіраўнік прарэктар ДДУ, дацэнт А. С. Заўялаў, дацэнт кафедры філасофіі, старшыня народнага кантролю універсітэта У. Я. Мамантаў, дацэнт кафедры гідрабіялогіі, намеснік старшыні прафкома Ф. П. Рабаў, дацэнт кафедры украінскай літаратуры Н. І. Заверталюк, намеснік сакратара камітэта камсамола Аляксандр Мельнікаў і вакальна-інструментальны ансамбль «Дняпране» на чале з Віктарам Багалюбавым.

У дзень прыезда па ініцыятыве камітэта камсамола і прафкома студэнты мехмата правялі для гасцей «Агеньчык дружбы». Ён садзейнічаў збліжэнню выхаванцаў двух універсітэтаў, прайшоў вельмі цікава і захапляюча.

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

## НА АГЛЯДЗЕ—ДАСЯГНЕННІ МАСКОЎСКАГА УНІВЕРСІТЭТА

Навучальныя ўстановы таксама, як і ўсе працоўныя калектывы савецкіх людзей, рыхтуюць дастойную сустрэчу слаўнаму 50-годдзю ўтварэння СССР. Іх поспехі знаходзяць шырокае адлюстраванне. У прыватнасці, 23 лістапада на ВДНГ у павільёне «Народная адукацыя» міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР тав. Ялюцін адкрыў выстаўку дасягненняў Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Ламаносава, якую мне пашчаслівілася наведаць.

Маскоўскі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца флагманам навукі ў нашай краіне. Звярнуся да некаторых лічбаў, якія гэтаму — красамоўнае сведчанне.

У МДУ навучаецца 27 тысяч студэнтаў. Тут працуе 6 тысяч чалавек прафесарска-выкладчыцкага саставу і навуковых работнікаў. Сярод іх — 45 акадэмікаў і 59 членаў-карэспандэнтаў АН СССР, звыш 700 дактароў і 2400 кандыдатаў навук, 23 Героі Сацыялістычнай Працы і столькі ж заслужаных дзеячоў навукі, 10 лаўрэатаў Ленінскай і 5 — Нобелеўскай прэмій.

У Маскоўскім універсітэце — 16 факультэтаў, 257 кафедр, 133 вучэбныя і 32 праблемныя лабараторыі, 105 вучэбных кабінетаў. Тут рыхтуюць спецыялістаў па 48 спецыяльнасцях. Штогод у МДУ абараняецца каля тысячы дысертацый.

У камсамольскай арганізацыі універсітэта — 23 тысячы членаў, а ў прафсаюзнай — 43 тысячы. Мінулым летам у будаўнічых атрадах працавала 5 тысяч студэнтаў.

Аб усім гэтым цікава і маляўніча расказваюць стэнды 16 факультэтаў, якія прадстаўлены на выстаўцы. Па іх можна шырока азнаёміцца з усімі аспектамі універсітэцкага жыцця.

Праўда, на мой погляд, некалькі недастаткова паказаны формы работы СНТ, яго прапаганда і сувязі з іншымі ВНУ краіны. Няма раздзела, які б расказваў аб укараненні тэлебачання ў працэс навучання і сучасных тэхнічных сродкаў у гэтай справе. Не адлюстравана работа прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый, што ў нейкай ступені таксама з'яўляецца ўпушчэннем.

У цэлым жа гэта выстаўка адыгрывае вялікую ролю ў прапагандзе перадавога вопыту вышэйшай навучальнай установы і паслужыць высакароднай мэце паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў для будаўніцтва камуністычнага грамадства ў СССР.

**М. БАЙДА,**
**старшыня прафкома.**

# АМАТАРАМ ЛІТАРАТУРЫ

Фонды бібліятэкі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта папоўніліся навінкамі па літаратуразнаўству. Першай прадстаўляецца ўвазе чытачоў кніга Нараўчатава **«Атлантыда побач з табой». «Крытыка, палеміка, разважанні», М. 1972. 350 стар.**

Імя таленавітага савецкага паэта С. Нараўчатава не адчувае патрэбы ў прадстаўленні шырокаму чытачу. Яго вершы з аднолькавай цікавасцю чытае і моладзь, і людзі ваеннага пакалення, з якім поплеч прайшоў паэт цяжкія дарогі ў гады вайны. Свет паэта — шырокі і шматгранны і доказ таму не толькі паэтычныя творы С. Нараўчатава, але і тая проза, натхнёная, эмацыянльная, напоўненая цікаўнасцю літаратуразнаўца і публіцыстычнасці партыйнага крытыка, з якой выступае С. Нараўчатаў у гэтай кнізе.

Чытач знойдзе тут душэўнай цеплынёй сагрэтыя старонкі ўспамінаў аб сустрэчах с М. Асеевым, Н. Маёравым, В. Бергольц, разважанні аб творчасці такіх паэтаў, як А. Туманян, А. Блок, А. Твардоўскі, палеміку па пытаннях майстэрства, якое адлюстроўвае ідэйную сталасць нашай літаратуры. Чытач, нарэшце, пранікне ў творчую лабараторыю самаго паэта і адчуе цягу да пошуку дакладнага слова, вобразу і з нічым непараўнальную радасць творчасці, якая і акрыляе паэта, і кліча да новых пошукаў. Краіна цудоўнага — Атлантыда — побач з намі, — гаворыць паэт. — Агляніцеся і вы ўбачаце вакол многа цікавага, яшчэ неразгаданага. Прыпомніце гісторыю культуры — і вашу ўвагу, напэўна, спыняць нечаканасці. Ад мінулага і сучаснага — да будучага —вось той шлях, якім ідзе паэт, прасочваючы развіццё традыцый класічнай літаратуры да лепшых вобразаў сучаснасці.

Не меншую цікавасць для чытачоў, асабліва тых, хто паглыблена вывучае творчасць Ф. Дастаеўскага, прадстаўляе кніга **М. Бахціна «Праблемы паэтыкі Дастаеўскага». М. 1972. 470 стар.**

Гэтая работа прысвечана праблемам паэтыкі Дастаеўскага і разглядае яго творчасць толькі пад гэтым вуглом. Аўтар лічыць Дастаеўскага адным з найвялікшых наватараў у галіне мастацкай формы. Дастаеўскі стварыў нібы новую мастацкую мадэль свету, у якой многія з асноўных момантаў старай мастацкай формы падвергнуліся карэннаму пераўтварэнню. Задача прапануемай работы і заключаецца ў тым, каб шляхам тэарэтыка-літаратурнага аналізу раскрыць гэта прынцыповае наватарства Дастаеўскага.

І, нарэшце, апошняя работа з навінак літаратуры — **«К. Пігараў. Руская літаратура і выяўленчае мастацтва». Нарысы аб рускім нацыянальным краявідзе сярэдзіны XIX стагоддзя, М., 1972, 122 стар.**

Работа з'яўляецца працягам даследвання «Руская літаратура і выяўленчае мастацтва (XVIII — першая чвэрць XIX века), якая выйшла ў 1966 годзе. Яна развівае цікавы і плённы вопыт параўнальнага вывучэння літаратуры і выяўленчага мастацтва у прыватнасці жывапісу.

Значэнне нацыянальнага краявіду ў творчасці Пушкіна, Лермантава, Някрасава, Аксакава, Гогаля, Тургенева, Талстога, краявіды Пярова, Саўрасава, Васільева, Шышкіна, Левітана, адкрыцці, зробленыя ў краявідзе літаратурай і жывапісам—такія асноўныя спектры кнігі.

**Н. ГУРЭВІЧ,**
**старшы бібліятэкар.**

# НА ВАРЦЕ ЗДАРОЎЯ

«Здароўе — усяму галава», — кажуць у народзе. Гэта сапраўды так. Будзе здароўе — будуць поспехі ў вучобе і працы, будуць трывалыя веды. Зберагчы і ўмацаваць сваё здароўе студэнтам дапамагаюць працаўнікі нашага медпункта на чале з урачом Э. І. Дадзёмавай. Апрача яе, тут працуюць фельчары К. Ф. Сляпухіна, Н. І. Марчанка і зубны ўрач Т. Г. Мітрафанава. Цёпла адгукваецца аб іх рабоце Эмілія Ісакаўна...

Дружны, згуртаваны калектыў, — кажа яна. — Усе маюць добрую спецыяльную падрыхтоўку, добрасумленныя, заўсёды ўважліва адносяцца да пацыентаў.

Работа медпункта вядзецца згодна з комплексным планам, зацверджаным рэктарам ГДУ і галоўным урачом паліклінікі № 6. Клопаты аб здароўі студэнтаў пачынаюцца яшчэ перад прыёмнымі экзаменамі. Улетку ўрач пункта здароўя знаёміцца з медыцынскімі карткамі абітурыентаў (форма 286) і дае рэкамендацыі аб прыёме на той ці іншы факультэт. Запаўняюцца ўрачэбна-кантрольныя карткі, бяруцца на ўлік хворыя. Для паступіўшых на першы курс арганізуюцца медыцынскія агляды. Да паслуг студэнтаў — тэрапеўт, спецыяліст — оталярынголаг, стаматолаг, пры неабходнасці прыцягваюцца неўрапатолаг, хірург і іншыя ўрачы з паліклінікі № 6.

Толькі ў кастрычніку гэтага года, напрыклад, агледжана 740 чалавек з першага курса. Выяўляюцца хворыя на рэўматызм, на язву 12-перснай кішкі, хранічныя захворванні нырак, печані і іншых органаў, з высокай ступенню блізарукасці і г. д.

Хворым аказваецца неабходная медыцынская дапамога, пры неабходнасці яны накіроўваюцца ў бальніцу, атрымліваюць пуцёўкі ў дамы адпачынку, у санаторыі і на курорты.

Вялікую работу праводзіць калектыў медпункта па прафілактыцы розных захворванняў (па папярэджванню), траўматызму. Гэта і вечары пытанняў і адказаў на медыцынскія тэмы, і лекцыі, і проста парады, пастаянны кантроль за арганізацыяй рабочых месц студэнтаў, за асветленасцю, запыленасцю, чысцінёй аўдыторый, за колькасцю хімічных пароў у лабараторыях, прафілактычныя прышчэпкі, сістэматычны кантроль за санітарным станам сталовай і буфетаў.

Медпункт працуе ў цесным кантакце з гаспадарчай часткай, з кафедрай грамадзянскай абароны, з інжынерам па тэхніцы бяспекі. Аб многім трэба паклапаціцца: і каб своечасова была заменена класная дошка ў той або іншай аўдыторыі, і каб добра была асветлена дарога паміж вучэбнымі карпусамі, інтэрнатамі, аб абсталяванні сушылкі для прасушвання абутку і аб устаноўцы электракалярыфераў, і аб многім іншым.

На пасяджэнні прафкома універсітэта разгледжана пытанне «Аб медыцынскім абслугоўванні студэнтаў універсітэта і мерах па яго паляпшэнню». Э. І. Дадзёмава зрабіла справаздачу аб працаёмкай паўсядзённай рабоце медпункта, расказала аб яго клопатах і турботах, адказала на пытанні членаў прафкома.

**У. БАГАМОЛЬНІКАЎ.**

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

# БІЁЛАГІ ЗДАЮЦЬ НАРМАТЫВЫ

Увядзенне новага комплексу ўсесаюзных выпрабаванняў на значок ГПА — выпрабаванняў сілы і магутнасці — яшчэ адно яскравае праяўленне клопатаў Савецкай улады аб укараненні фізічнай культуры і спорту ў паўсядзённае жыццё савецкіх людзей. Пакладзен пачатак новаму этапу ў развіцці савецкай сістэмы фізічнага выхавання, далейшай практычнай рэалізацыі задачы аб пераходзе ад масавага да агульнанароднага фізкультурнага руху, якая была выстаўлена партыяй і ўрадам у вядомай жнівеньскай Пастанове 1966 года.

У ГПА — слаўная гісторыя. Словы «Гатоў да працы і абароны СССР» упершыню прагучалі ў маі 1930 года са старонак «Комсомольской правды». Для мільёнаў савецкіх людзей розных пакаленняў комплекс выпрабаванняў на значок ГПА быў школай мужнасці, дараваў здароўе, сілу, бадзёрасць. Комплекс паслужыў асновай усёй савецкай сістэмы фізічнага выхавання.

На старт ГПА выйшлі супрацоўнікі біёлага — глебавага факультэта. Жыва і цікава праходзілі спаборніцтвы па мнагабор'ю ГПА.

Перад пачаткам спаборніцтваў кожны здаючы прайшоў строгі медыцынскі агляд і толькі пасля дазволу ўрача быў дапушчан да здачы норм.

Супрацоўнікі факультэта, узначальваемыя в. а. дэкана факультэта, доктарам сельскагаспадарчых навук, прафесарам Ф. М. Харытановічам, паказалі добрую фізічную падрыхтоўку. Так, напрыклад, прафесар Ф. М. Харытановіч перавысіў норму ў штурханні набіўнога мяча, дацэнт В. І. Кузняцоў і в. а. дацэнта В. П. Ксянзоў намнога перавысілі нарматыў згінанне і разгінанне рук ва ўпоры на гімнастычай скамейцы, а в. а. дацэнта Л. М. Сапегін выканаў гэты нарматыў 21 раз.

42 супрацоўнікі біёлага-глебавага факультэта прынялі ўдзел у стартах.

Уперадзе спаборніцтвы па лыжнаму спорту, плаванню і стральбе.

...У ГПА наступае новае, складанае і цудоўнае жыццё. Заклік, народжаны 40 гадоў назад Ленінскім камсамолам: «Моцныя мышцы, пільнае вока патрэбны кожнаму працоўнаму» — своечасовы і сёння. Дык няхай дапаможа ўсім нам ударна працаваць, моцна кахаць і берагчы Радзіму праслаўлены ГПА — нашы клопаты і наша гордасць!

**В. МАРЧАНКА,**
**нам. дэкана па спартыўна-масавай рабоце.**

# І ВЕСЕЛА, І ЗАХАПЛЯЮЧА







**На факультэце фізічнага выхавання паспяхова прайшлі спаборніцтвы студэнтаў трэцяга курса па рухомых гульнях «Спартландыя». У іх было шмат захапляючых мінут, шчырага вяселля. Гэты фотарэпартаж адлюстроўвае толькі некаторыя эпізоды цікавага мерапрыемства.**

**НА ЗДЫМКАХ (зверху ўніз): Практыкаванне выконвае каманда «Чабурашка». Падтрымка балельшчыкаў — вялікая сіла. А як справы ў «Зіп-зіп?»**

# *Уладзімір Бесараб— майстар спорту*

Вось ужо пяць год запар у сталіцы Туркменскай ССР —горадзе Ашхабадзе ў дзень святкавання Дня Канстытуцыі СССР праводзяцца ўсесаюзныя спаборніцтвы легкаатлетаў-марафонцаў.

Масава прайшоў сёлетні старт, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння Саюза ССР. За перамогу змагаліся спартсмены 92 гарадоў краіны, прадстаўнікі ўсіх саюзных рэспублік. Сярод іх была вялікая група майстроў спорту, таму дэбютантам давялося вытрымать вострую канкурэнцыю.

На старт прабегу ўпершыню выйшлі студэнты факультэта фізічнага выхавання Уладзімір Бесараб, Генадзь Высоцін і выпускнік нашага універсітэта 1972 года Аркадзь Белы.

Марафонскі бег — цяжкае патрабаванне для спартсмена. Не была лёгкай траса і на гэты раз. І тым не менш выдатна правёў спаборніцтвы студэнт другога курса Уладзімір Бесараб. Ён першым закончыў дыстанцыю і заваяваў залаты медаль. 42 кіламетры 195 метраў Уладзімір пераадолеў за 2 гадзіны 22 мінуты 43 секунды. У. Бесараб упершыню выканаў нарматыў майстра спорту Савецкага Саюза.

# ВЫСТУПАЮЦЬ ШТАНГІСТЫ

Закончылася каманднае першынство Гомеля па цяжкай атлетыцы. Штангісты ГДУ занялі ў ім другое месца.

У сваіх вагавых катэгорыях перамог дабіліся С. Вартанян і У. Эцін, а М. Навалетаў, М. Кузянёк і Ф. Шылак — сталі другімі прызёрамі.

# ДЗВЕ ПЕРАМОГІ БАСКЕТБАЛІСТАЎ

Восем мужчынскіх і 6 жаночых каманд аспрэчвалі кубкі горада Гомеля па баскетболу. У папярэдніх гульнях лепшага поспеху дабіліся мужчынскія каманды БІІЧТу і ГДУ. Чыгуначнікі перамаглі спартсменаў дзіцяча — юнацкай спартыўнай школы № 2 і таварыства «Чырвоны сцяг», а універсітэцкія баскетбалісты выйгралі ў каманд «Гомсельмаша» і электратэхнічнага завода.

У фінальным матчы сустрэліся старыя сапернікі. Паядынак двух студэнцкіх калектываў праходзіў вельмі напружана. Уся гульня ішла ачко ў ачко. Добра завяршаў атакі БІІЧТаўцаў Аляксандр Горбач, але таварышы не змаглі яго падтрымаць. У нашых баскетбалістаў у нападзенні вынікова дзейнічалі Юрый Тумаш, Леанід Каржуеў і Ігар Каплан. Толькі два ачкі вырашылі лёс кубка — з лікам 76:74 перамаглі спартсмены ГДУ.

З перавагай студэнцкіх каманд прайшоў і жаночы турнір. У рашаючым матчы выявілася перамога баскетбалістак універсітэта. Ім уручан кубак.

# ЗА ПУЦЁЎКІ Ў ФІНАЛ

Гандбалісты вышэйшых навучальных устаноў Беларусі пачалі барацьбу за ўзнагароды Белсавета таварыства «Буравеснік». Чарговы чэмпіянат праходзяць у два этапы.

Учора ў спартыўнай зале універсітэта пачалося занальнае першынство. Пуцёўкі ў фінал сярод мужчынскіх каманд аспрэчваюць спартсмены Мінскага радыётэхнічнага, Магілёўскага машынабудаўнічага, Брэсцкага педагагічнага інстытутаў, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і Наваполацкага філіяла Беларускага тэхналагічнага інстытута. Калектывы, якія зоймуць першыя два месяцы, працягнуць барацьбу за залатыя медалі.

Шэсць жаночых каманд павінны былі выступаць у гомельскім турніры, але не ўсе яны прымаюць удзел у спаборніцтвах. Толькі спартсменкі ГДУ і Беларускага політэхнічнага інстытута сустрэнуцца паміж сабой за першае месца ў падгрупе.

**В. КРУКОЎСКІ.**

Фотаздымкі для гэтага нумару газеты зрабіў **А. Рудчанка.**

В. а. рэдактара Ул. БАЛОГА.

АЗ 32599 **«Гомельский университет»—орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке).** Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Заказ 7027